


Сяргей ЕЛІЗАРАЎ

# "ПРАДВЫЗНАЧЫЦЬ ПРЫЗНАЧЭННЕ...": наменклатура і саветы БССР у 1930-я гг.

*У сістэме кіравання СССР, у тым ліку і БССР, выключную ролю адыгрывала наменклатурная сістэма, афармленне якой прыйшлося на 1930-я гады.*

Кадравую наменклатуру па сваім змесце і значэнні можна разглядаць па двух напрамках. У першую чаргу, як арганізацыйна-тэхнічны бок кадравай палітыкі. У такім выпадку наменклатура ўяўляе сабой пералік пасад той ці іншай ўстановы, арганізацыі або прадпрыемства. Сама па сабе наяўнасць наменклатуры кадраў з'яўляецца тыповай, ахоплівае ўсе катэгорыі работнікаў, занятых у розных галінах эканомікі, у органах гаспадарчага і дзяржаўнага кіравання, служыць асновай для распрацоўкі службовых характарыстык, схем службовых акладаў, штатаў прадпрыемстваў і ўстаноў і г. д.

З іншага боку ў савецкай рэчаіснасці наменклатура перш за ўсё была з'явай палітычнай. Яна складала найважнейшы элемент забеспячэння за кіруючай камуністычнай партыяй рэальнай магчымасці вызначаць стратэгічныя і тактычныя мэты і задачы развіцця савецкага грамадства, метады і сродкі іх рэалізацыі, канцэнтраваць у сваіх руках усе рэсурсы ўлады (палітычныя, эканамічныя, сілавыя, ідэалагічныя), падпарадкоўваць сабе ўсе дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі і дыктаваць ім сваю волю. У гэтым выпадку наменклатура ўяўляла сабой пералік пасад, займанне якіх вызначалася партыйнымі органамі. Адпаведна з рангам у іерархіі кожны партыйны орган (ад саюзнага ЦК да райкама) меў свае ўласныя наменклатуры такіх пасад.

Гэты механізм кадравых рашэнняў распаўсюджваўся не толькі на ўласна кадры партыйнага апарату, але на ўсю сістэму дзяржаўных, грамадскіх, кааператыўных, гаспадарчых органаў. У дадзеным артыкуле аўтар перш за ўсё звярнуў увагу на выкарыстанне наменклатурнай сістэмы ў органах саветаў. Менавіта саветы аб'яўляліся палітычнай асновай савецкага грамадства, менавіта за імі ўсімі Канстытуцыямі СССР замацоўваўся статус вышэйшых органаў улады і кіравання. Саветы разглядаліся бальшавікамі як праява сапраўднай дэмакратыі працоўнага народа (у параўнанні з заходняй), адным з паказчыкаў якой лічылася выбарнасць іх кіраўнікоў. Але свабодныя выбары — гэта заўсёды рызыка страты ўлады. Такім чынам, разам з захаваннем ідэалагемы "Саветы —



**_ЕЛІЗАРАЎ Сяргей Аляксандравіч._**

*Прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, доктар гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1955 г. у Архангельску (Расія). У 1978 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1983 г. — аспірантуру БДУ. У 2013 г. абараніў доктарскую дысертацыю па тэме "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)". Аўтар манаграфіі "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)" (Гомель, 2009), больш за 170 навуковых і метадычных публікацый.*

вышэйшая праява сапраўднай дэмакратыі" бальшавікам з іх імкненнем да манапольнай улады неабходна было распрацаваць такі механізм, які гарантаваў бы займанне ключавых пасад у афіцыйных дзяржаўных органах толькі асобамі, якіх на гэтыя пасады накіруе камуністычная партыя, і ніякімі іншымі.

З першых дзён савецкай улады бальшавікі мэтанакіравана імкнуліся узяць пад свой кантроль пытанні кадравай палітыкі не толькі ў самой партыі, але і ў саветах, прафсаюзах, гаспадарчых і кааператыўных арганізацыях. Аднак першапачаткова гэты працэс не насіў планавага характару, а размеркаванне работнікаў і замяшчэнне пасад ажыццяўлялася *"па памяці, на вока, па ўражанню і чуццю"*[1].

Наменклатура ў яе інстытуцыйнай форме склалася ў 1920-я гг. як сістэма партыйнага ўліку кіруючых кадраў розных узроўняў[2]. Першапачаткова гэтым займаліся ўлікова-размеркавальныя аддзелы ЦК і губкамаў партыі. З 1924 г. у ЦК РКП(б) кадравая работа пачала канцэнтравацца ў арганізацыйна-размеркавальным аддзеле (загадчык — Л.М.Кагановіч), у ЦК КП(б)Б — у арганізацыйным аддзеле (загадчык — У.П.Трунтаеў, 41-гадовы ўраджэнец Саратаўскай губерні, член РКП(б) з 1918 г., пасля 1924 г. працягваў партыйную кар'еру за межамі БССР), у структуры якога быў створаны адмысловы ўліковаразмеркавальны пададдзел. У акругах размеркаванне кадраў ляжала на ўлікова-статыстычных пададдзелах аргаддзелаў акруговых камітэтаў КП(б)Б.

Афіцыйнае ж з'яўленне інстытута наменклатуры ў СССР большасць даследчыкаў адносяць да восені 1925 г. 16 лістапада 1925 г. Аргбюро ЦК РКП(б) прыняло пастанову "Аб парадку падбору і прызначэння работнікаў" і інструкцыю "Аб формах узгаднення прызначэнняў і перасоўванняў кіруючых работнікаў мясцовых устаноў"[3]. Пастановай зацвярджаліся наменклатуры пасад, займанне якіх у рознай ступені кантраляваў ЦК РКП(б). Наменклатура № 1 утрымоўвала спіс пасад (у тым ліку і выбарных), прызначэнне на якія праходзіла толькі пастановай ЦК *"без залежнасці ад таго, ці з'яўляецца назначаемы членам РКП або беспартыйным"*. Наменклатура № 2 уключала пасады, занятак якіх патрабаваў узгаднення з аргразмеркам ЦК. Наменклатура № 3 (ведамасная) складалася з пасад, падбор і прызначэнне на якія рабіліся па спісе, які вызначаўся самастойна кожным цэнтральным ведамствам па ўзгадненні з аргразмеркам ЦК і з неабходнасцю абвяшчэння апошняга аб праведзеных прызначэннях.

Адпаведна і ў БССР былі распрацаваныя свае наменклатуры: ЦК КП(б)Б, акруговых камітэтаў і райкамаў партыі. Наменклатура ЦК КП(б)Б дыферэнцыравалася па 14 групах: партыйная, прапагандысцка-выхаваўчая, прафесійная, аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння, савецкая адміністрацыйная, судова-карная, прамыслова-вытворчая, фінансавая, крэдытная, кааператыўная, гандлёвая, планавая, зямельная, транспарту і сувязі. На люты 1926 г. наменклатура № 1 (спіс пасад, прызначэнне і зняцце па якіх ажыццяўлялася ў адпаведнасці з рашэннямі Бюро або Сакратарыята ЦК КП(б)Б) уключала 117 пасад. У наменклатуру № 2 (спіс пасад, прызначэнне і зняцце з якіх патрабавалі папярэдняга зацвярджэння ва ўлікова-размеркавальным пададдзеле ЦК КП(б)Б) уваходзіла 50 пасад. У спіс наменклатуры № 3 (ведамаснай) уключаліся 20 пасад, якія знаходзіліся на ўліку ва ўлікова-размеркавальным пададдзела ЦК КП(б)Б[4]. Адпаведна свае наменклатуры складалі акруговыя камітэты і райкамы КП(б)Б.

Спісы наменклатур з кожным годам пашыраліся — партыйныя органы бралі пад свой непасрэдны кантроль усё больш і больш пасад. У 1929 г. у наменклатуры № 1 ЦК КП(б)Б налічвалася ўжо 253 пасады, у наменклатуры № 2 — 175. Па групе савецкіх адміністрацыйных работнікаў у "цэкоўскую" наменклатуру № 1 ўваходзілі 25 пасад, у тым ліку старшыні ЦВК і СНК БССР, два намеснікі старшыні СНК БССР, упаўнаважаны прадстаўнік БССР пры ўрадзе СССР і яго намеснік, наркам унутраных спраў і яго намеснік (астатнія наркамы праходзілі па адпаведных галіновых групах), начальнік рэспубліканскай міліцыі, інструктары ЦВК, старшыні акрвыканкамаў і іх намеснікі і г. д. У наменклатуры № 2 значыліся адказныя супрацоўнікі ЦВК і НКУС, сакратары акрвыканкамаў (усяго 7 пазіцый).

Афармленне класічнай наменклатурнай сістэмы ў СССР прыйшлося на 1930-я гг. У сувязі з пераходам на мяжы 1920—1930-х гг. да палітыкі фарсіраванага будаўніцтва сацыялізму ў СССР вельмі важным для партыйных уладаў было забяспечыць гэты працэс кадрамі, якія безумоўна прынялі новы курс як адзіны магчымы і адзіна правільны, здольнымі, нягледзячы ні на якія ахвяры (у тым ліку і людскія), паслядоўна і няўхільна праводзіць яго на месцах. Новыя задачы запатрабавалі і рэарганізацыі наменклатурнай сістэмы: канцэнтрацыя кадравай палітыкі толькі ва ўлікова-размеркавальных структурах партапарату (аргразмерку ЦК УсеКП(б), улікова-размеркавальных органах нацыянальных кампартый, мясцовых партарганізацый) з пашырэннем наменклатурных спісаў ператварала сам працэс прызначэння і перамяшчэння работнікаў у фармальную працэдуру, у "штампаванне" кадравых рашэнняў. Такая сітуацыя вышэйшае партыйнае кіраўніцтва СССР відавочна не задавальняла. У студзені 1930 г. ЦК УсеКП(б) прызнаў неабходнасць *"рэарганізаваць апарат ЦК і мясцовых арганізацый такім чынам, каб ён паспяхова вырашыў новыя складаныя задачы, асабліва задачы падбору, размеркавання і падрыхтоўкі кадраў"*. Аргразмерк ЦК УсеКП(б) падзяляўся на два самастойныя аддзелы: арганізацыйна-інструктарскі і аддзел размеркавання. У кадравай палітыцы на аргінструктарскі аддзел ускладаліся падбор і размеркаванне кадраў партыйнага апарату, а на аддзел размеркавання — усіх адміністрацыйна-гаспадарчых і прафсаюзных работнікаў (першым яго кіраўніком прызначаны І.М.Масквін, якога ў лістападзе 1930 г. змяніў М.І.Яжоў). Пытанні кіруючых кадраў іншых галін сталі прэрагатывай аддзела культуры і прапаган-

ды (кадры культуры, асветы, друку, прапаганды марксізму-ленінізму) і аддзела агітацыі і масавых кампаній (кадры, якія арганізоўваюць і праводзяць розныя масавыя кампаніі — передвыбарчыя, пасяўныя, хлебанарыхтоўчыя і г.д .).

У аргінструктарскім аддзеле сярод трох сектараў вылучаўся сектар, які займаўся пытаннямі рэгулявання складу партыі і падбору кадраў партапарату. У размеркаддзеле ствараліся 8 сектараў па напрамках: цяжкай прамысловасці, лёгкай індустрыі, транспарту, сельскагаспадарчы, замежных кадраў, фінансава-планава-гандлёва-каапературыўны, савецка-адміністрацыйны і ўліковы. Кадравая работа ў аддзеле агітацыі і прапаганды вялася па трох сектарах: навуковай работы і асветы (у тым ліку і мастацтва), прапаганды марксізму-ленінізму, друку (у тым ліку газеты і мастацкая літаратура). Па чатырох сектарах была размеркаваная работа па прызначэнні і перасоўванні кіруючых кадраў у аддзеле агітацыі і масавых кампаній[6].

Перабудоўвалася работа і ніжэйшых парторганаў. У лютым 1930 г. Сакратарыят ЦК КП(б)Б падакладзе загадчыка аргаддзела ЦК КП(б)Б В.Р.Гантмана* зацвердзіў новую структуру апарата ЦК КП(б)Б. Замест аргаддзела з'явіўся арганізацыйна-інструктарскі аддзел (тут за кадравыя пытанні адказваў сектар прапрацоўкі пытанняў партбудаўніцтва, рэгулявання сацыяльнага складу партарганізацый і падбору кадраў партапарата). Аддзел размеркавання (з лістапада 1930 г. — аддзел кадраў, першы кіраўнік — З.З.Кавальчук**) складаўся з трох сектараў: па падборы і размеркаванні супрацоўнікаў савецкіх і гаспадарчых устаноў па падборы і размеркаванні прафработнікаў, сектар уліку. Кадравымі пытаннямі астатніх займаліся аддзел агітацыі і масавых кампаній, аддзел культуры і прапаганды. Аналагічная сістэма ствараліся і ў апаратах акружкамаў[7].

У сувязі з праведзенай летам 1930 г. рэарганізацыяй адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення БССР, пераходам на двухзвеннявую сістэму "сельсавет — раён" і ліквідацыяй акруговых органаў улады і кіравання ўзнікла неабходнасць карэкціроўкі складу наменклатур — рэспубліканскай і раённай. Сакратарыят ЦК КП(б)Б 1 кастрычніка 1930 г. зацвердзіў новую наменклатуру № 1 ЦК КП(б)Б. Яна пашырылася за кошт уключэння ў яе склад пасад раённага ўзроўню, якія да гэтага ўваходзілі ў пералікі акруговых і раённых наменклатур. Так, па савецкай адміністрацыйнай галіне работы з акруговай наменклатуры ў наменклатуру № 1 ЦК КП(б)Б перайшлі старшыні райвыканкамаў, з раённай — загадчыкі фінансавымі і зямельнымі аддзеламі райвыканкамаў, старшыні Віцебскага, Гомельскага і Мінскага гарсаветаў[8].

Варта ўлічваць, што паняцце "савецкія адміністрацыйныя кадры" ў той час выразнага значэння не мела. На працягу 1920—1930-х гг. у яго маглі ўваходзіць самыя розныя пасады (як выбарныя, так і прызначаныя), але ў асноўным фігуравалі супрацоўнікі, непасрэдна занятыя ў апараце выканаўчых органаў саветаў (кіруючыя работнікі ЦВК і СНК БССР, старшыні выканкамаў, гарсаветаў, загадчыкі аддзеламі, сектарамі, часткамі, інспектары і інструктары, старшыні сельсаветаў, да 1934 г. — работнікі міліцыі).

Значныя змены адбыліся ў наменклатурнай сістэме ў 1931 г. Няўхільнае пашырэнне кола пасад, якія ўваходзілі ў наменклатуру партыйных органаў, актуалізавала праблему пераадолення "механічнага штампавання прызначэнняў" і "зніжэння адказнасці ведамстваў за становішча з кадрамі". Канцэнтрацыя ўсёй наменклатурнай працы ў руках аднаго размеркавальнага органа не толькі значна зніжала эфектыўнасць гэтай працы, але і выклікала прэтэнзіі іншых структур партапарата. Адсутнасць у супрацоўнікаў галіновых аддзелаў магчымасці рэальна ўплываць на кадравыя перамяшчэнні ў сферах сваёй адказнасці ва ўмовах разрастання і ўмацавання адміністрацыйна-каманднай сістэмы арганізацыі і функцыянавання ўладных інстытутаў у вялікай ступені абмяжоўвала іх рэсурсы ўздзеяння на падведамных кіраўнікоў. Атрыманне ж у свае рукі такога магутнага рычага, як прызначэнне і зняцце адказных работнікаў адпаведнага профілю, вызначэнне іх кар'ернага лёсу, рабіла ўвесь партапарат паўнаўладным кіруючым органам. Гэта ўзмацняла ў кіраўніцкай сістэме ролю асабістых сувязяў мясцовых кадраў з апаратам ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б, спрыяла ўмацаванню кліенталізму ў сістэме "цэнтр — рэгіён".

У верасні 1931 г. аддзелам кадраў ЦК КП(б)Б быў прапанаваны варыянт рэарганізацыі наменклатурнай сістэмы, згодна з якой наменклатура ЦК КП(б)Б падзялялася на дзве часткі: размеркавальную і ўліковарэзервовую. Размеркавальная наменклатура ўключала ў сябе пералік пасад, па якіх прызначэнне і перасоўванне работнікаў праводзілася выключна пастановамі пленумаў, Бюро або Сакратарыята ЦК КП(б)Б. Улікова-рэзервовая ж павінна была стаць базай для выяўлення і стварэння рэзерву кадраў для пасад размеркавальнай наменклатуры[9].

* Гантман Веніямін Раманавіч (1891—1937) — ураджэнец г. Рэчыца Мінскай губерні, яўрэй, з сям'і саматужнікаў, член РКП(б) з 1918 г., у 1928—1930 гг. — загадчык аргаддзелам ЦК КП(б)Б, 1930—1932 гг. — загадчык аргінструктарскім аддзелам ЦК КП(б)Б, с 1932 по 1937 гг. — на кіруючых партыйных пасадах у Расіі і Украіне. Арыштаваны ў Днепрапятроўску (УССР) у жніўні 1937 г. як *"удзельнік трацкісцкай тэрарыстычнай групы"*. Расстраляны ў верасні 1937 г. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР у верасні 1956 г.

**Кавальчук Захар Захаравіч (1893—1937) — ураджэнец в. Крыўляны Пружанскага павета Гродзенскай губерні, беларус, член РКП (б) з 1920 г., 1930—1931 гг. — загадчык аддзелам кадраў ЦК КПБ, 1932—1936 гг. — старшыня Цэнтральнага савета прафсаюзаў БССР, у 1937 г. — дырэктар Мінскага рыбакансервавага завода. Арыштаваны ў ліпені 1937 г. як *"актыўны ўдзельнік контррэвалюцыйнай тэрарыстычна-шпіёнскай арганізацыі"*. Расстраляны 30 кастрычніка 1937 г. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 15 верасня 1956 г.

*Табліца*

**Сферы наменклатурнай адказнасці аддзелаў ЦК КП(б)Б[11]**

| Аддзелы ЦК КП(б)Б | Размеркавальная | | Улікова-рэзервовая | |
|---|---|---|---|---|
| | пасад | % | пасад | % |
| арганізацыйны | 184 | 10,6 | 645 | 16,8 |
| агітацыйна-масавы | 9 | 0,2 | 12 | 0,02 |
| культурна-асветніцкі | 164 | 10,4 | 180 | 6,5 |
| кадраў | 760 | 78,2 | 1625 | 45,4 |
| **у тым ліку сектары аддзела кадраў:** | | | | |
| прамысловы | 155 | | 300 | |
| транспарту і сувязі | 35 | | 168 | |
| сельскагаспадарчы | 173 | | 400 | |
| забеспячэнска-кааператыўны | 112 | | 343 | |
| савецкі адміністрацыйны | 275 | | 414 | |

Гэты праект быў разгледжаны на пасяджэнні Сакратарыята ЦК КП(б)Б 21 верасня 1931 г., вынікам чаго стала пастанова "Аб наменклатуры ЦК КП(б)Б, сістэме падбору і размеркавання кадраў"[10]. Замацоўвалася новае дзяленне на наменклатуры — размеркавальную і ўлікова-рэзервовую (такі падзел усталёўваўся і для ўсіх цэнтральных ведамстваў, райкамаў і гаркамаў партыі). Аддзелы ЦК КП(б)Б павінны былі *"сканцэнтраваць сваю штодзённую працу на падборы і размеркаванні работнікаў выключна размеркавальнай наменклатуры ЦК"*, а адказнасць за стан улікова-размеркавальнай наменклатуры ўскладалася *"выключна... на райкамы"*.

Змяшчаліся ў праекце прапановы аб некаторым павышэнні ролі шэрагу наркаматаў і ведамстваў у расстаноўцы "сваіх" кадраў, але яны падтрыманыя не былі, бо абмяжоўвалі манаполію партыйнага апарату ў кадравай палітыцы. У выніковай пастанове было зафіксавана толькі агульнае патрабаванне захоўваць раўнавагу паміж мясцовымі партыйнымі органамі і цэнтральнымі ведамствамі пры вырашэнні кадравых пытанняў: райкамам і гаркамам партыі забаранялася прызначаць і перамяшчаць работнікаў, якія ўваходзілі ў размеркавальную наменклатуру ведамстваў, без папярэдняга ўзгаднення з канкрэтным ведамствам. У сваю чаргу наркаматы і рэспубліканскія ўстановы абавязаныя былі ўзгадняць свае рашэнні аб перамяшчэнні работнікаў мясцовай размеркавальнай наменклатуры з райкамамі і гаркамамі КП(б)Б.

Усяго ў дзве наменклатуры ЦК КП(б)Б увайшлі 3579 работнікаў. У асноўнай — размеркавальнай — значылася 1117 чалавек. Вышэйшы пласт рэспубліканскай наменклатуры (дзевяць чалавек) зацвярджаўся Пленумам ЦК КП(б)Б і ўключаў двух сакратароў ЦК КПБ, старшыняў ЦВК БССР і СНК БССР, загадчыкаў аддзеламі ЦК КП(б)Б, галоўнага рэдактара газеты "Звязда". Прыступкай ніжэй знаходзіліся работнікі, якіх зацвярджала Бюро ЦК КП(б)Б (235 чалавек), у тым ліку (акрамя партыйных пасад) сакратар ЦВК і тры намеснікі старшыні СНК БССР, старшыня і члены Прэзідыума Дзяржплана, наркамы і іх намеснікі, вышэйшы кіруючы склад рэспубліканскіх АДПУ і міліцыі, пракурор рэспублікі, старшыня Вярхоўнага суда і інш. У іх складзе была прадстаўлена таксама мясцовая савецкая вертыкаль улады і кіравання (20 чалавек): старшыні Віцебскага, Гомельскага і Мінскага гарсаветаў, старшыні 17 прыгранічных райвыканкамаў (усе пасады — выбарныя). Асноўная частка размеркавальнай наменклатуры знаходзілася ў сферы адказнасці Сакратарыята ЦК КП(б)Б — 873 супрацоўніка: з савецкіх работнікаў рэспубліканскага ўзроўню тут вырашаўся кар'ерны лёс загадчыкаў аддзеламі і камісіямі ЦВК і СНК БССР, некаторых кіруючых работнікаў рэспубліканскіх наркаматаў і ведамстваў. Спіс пасад раённага і гарадскога ўзроўню ўключаў старшыняў райвыканкамаў (акрамя прыгранічных), загадчыкаў зямельнымі і фінансавымі аддзеламі Мінскага, Віцебскага, Гомельскага гарсаветаў і 17 прыгранічных раёнаў (усяго — 75 чалавек).

Усе савецкія адміністрацыйныя кадры праходзілі праз аддзел кадраў. Усяго па размеркавальнай наменклатуры ЦК КП(б)Б гэты аддзел кантраляваў 78,2% усіх наменклатурных работнікаў, па ўліковарэзервовай — 45,4 % *(гл. табліцу)*. Яго супрацоўнікі займаліся пытаннямі прызначэння і перамяшчэння кадраў у органах дзяржаўнай улады і кіравання, прафсаюзах, ДПУ і міліцыі, у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, у сферах аховы здароўя, асветы, гандлю, фінансаў, працы, на прадпрыемствах кааператыўных, забеспячэнскіх, транспарту і сувязі, гандлю.

Улікова-рэзервовая наменклатура ЦК КП(б)Б уключала 2462 работнікаў. Па савецкай галіне ў ёй значыліся галоўным чынам мясцовыя кадры: 55 загадчыкаў зямельнымі і фінансавымі аддзеламі райвыканкамаў (акрамя прыгранічных), 22 эканамісты раённых планавых частак, 75 райінспектараў народнай асветы, 17 раённых (прыгранічных) і 7 гарадскіх інспектараў працы і сацыяльнага страхавання, інспектары аховы здароўя 9 райвыканкамаў, 24 работнікі гарадской і раённай міліцыі. Улікова-рэзервовая наменклатура была поўнай "вотчынай" аддзелаў ЦК — тут яны самастойна (пры неабходнасці — узгадняючы гэтыя перамяшчэнні з наркаматамі, ведамствамі і мясцовымі органамі) вырашалі пытанні прызначэння і перамяшчэння "сваіх" наменклатурных работнікаў.

Па падабенстве наменклатуры ЦК КП(б)Б складаліся і наменклатуры райкамаў і гаркамаў партыі, цэнтральных ведамстваў і арганізацый, якія зацвярджаліся профільнымі аддзеламі ЦК КП(б)Б. У абавязковым парадку гэтыя наменклатуры ўключалі мясцовыя кадры "цэкоўскай" размеркавальнай наменклатуры. У тыповую структуру размеркавальнай наменклатуры райкамаў КП(б)Б па савецкіх кадрах уваходзілі старшыні, загадчыкі агульнымі аддзеламі, сакратары райвыканкамаў і гарсаветаў, інспектары народнай асветы, працы, забеспячэння, аховы здароўя, дырэктары камбінатаў мясцовай прамысловасці, раённыя планавікі, старшыні сельсаветаў[12].

Канкрэтны склад раённых і гарадскіх наменклатур адрозніваўся ў залежнасці ад статусу адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (прыгранічныя або тылавыя), іх эканамічнага і людскога патэнцыялу, адміністрацыйнага і эканамічнага значэння іх цэнтраў. Колькасць усёй раённай наменклатуры (разам з "цэкоўскім" сегментам) па 72 сельскіх раёнах можна вызначыць у межах 850—900 чалавек райвыканкамаўскага апарату і 1400 сельсаветаўскага (усяго — каля 2250—2300 чалавек). Такім чынам, наменклатурная частка раённага апарату ўлады і кіравання складала прыкладна 40% ад яго агульнай колькасці[13].

Наменклатурная сістэма на рубяжы 1920—1930-х гг. яшчэ не ўяўляла сабой добра адладжаны механізм. Мясцовыя партыйныя органы не баяліся праяўляць самастойнасць у кадравых пытаннях аж да прамога процідзеяння рашэнням вышэйшых органаў, што перш за ўсё было звязана з вострым кадравым дэфіцытам у раёнах. Правяраючы работу апарату ЦК КП(б)Б, прадстаўнік ЦК УсеКП(б) М.Сабашнікаў у жніўні 1931 г. у лісце першаму сакратару ЦК КП(б)Б К.В.Гею прыводзіў нямала такіх фактаў. У прыватнасці, сакратар Полацкага райкама партыі рашэнне ЦК КП(б)Б аб перакідцы двух раённых работнікаў у іншы раён *"адкрыта ігнараваў... і дайшоў да заявы аб тым, што работнікаў гэтых могуць узяць толькі ў выпадку, калі пераступяць праз яго (сакратара) труп... гэты-ж сакратар замест таго, каб даслаць у ЦК работнікаў для перамоваў па прапанове Аддзела кадраў, не толькі не даслаў гэтых работнікаў, а катэгарычна папярэдзіў апошніх — калі па іншых абставінах яны патрапяць у Менск — аб тым, што яны ні ў якім выпадку ў ЦК не заходзілі"*. Асвейскі райкам КП(б)Б у адказ на рашэнне аб пераводзе з раёна загадчыка райбанкам даў указанне работнікам раённага АДПУ яго *"не выпускаць (не даваць пропуску)"*[14]. У тым жа годзе Сакратарыят ЦК КП(б)Б паказаў Смалявіцкаму райкаму партыі *"на недапушчальнасць"* пераводу старшыні раённай кантрольнай камісіі на пасаду старшыні райвыканкама без ведама ЦК і ЦКК КП(б)Б[15].

Нярэдка райкамы КП(б)Б прымалі кадравыя рашэнні без неабходнага ўзгаднення з рэспубліканскімі ведамствамі. У ліпені 1933 г. наркам фінансаў БССР А.Хацкевіч звярнуўся да загадчыка аддзела кадраў ЦК КП(б)Б М.М.Дзеніскевіча* са скаргай на райкамы партыі, якія без ведама і ўзгаднення з Наркамфінам выкарыстоўвалі фінансавых работнікаў не па іх прызначэнні (у прыватнасці, пераводзячы іх на пасады старшыняў сельсаветаў). У адказ на гэта Сакратарыят ЦК КП(б)Б абавязаў райкамы партыі *"спыніць перакідванні загадчыкаў райфінаддзелаў, дырэктараў банкаў, загадчыкаў ашчадных кас і іншых работнікаў без папярэдняга ўзгаднення з наркамфінам"*[16].

Чарговая спроба павысіць эфектыўнасць наменклатурнай работы была зроблена ў 1934 г. Новая рэдакцыя Статута УсеКП(б), зацверджаная XVII партз'ездам (студзень — люты 1934 г.), зафіксавала і новую структуру пабудовы партыйнага апарату. У прыватнасці, у ЦК кампартый саюзных рэспублік ствараліся вытворча-галіновыя аддзелы: сельскагаспадарчы, прамыслова-транспартны, савецка-гандлёвы, культуры і прапаганды ленінізму, кіруючых парторганаў і асобы сектар. Згодна са Статутам, цяпер у кожным з гэтых аддзелаў засяроджвалася ўся праца ў цэлым па дадзенай галіне, у тым ліку размеркаванне і падрыхтоўка кадраў[17]. У выніку дэцэнтралізацыя наменклатурнай працы ўнутры апарату ЦК КП(б)Б яшчэ больш узмацнілася. У прыватнасці, у новай структуры замест аддзела кадраў савецкімі адміністрацыйнымі кадрамі сталі займацца савецка-гандлёвы, сельскагаспадарчы і прамыслова-транспартны аддзелы.

Далейшае развіццё наменклатурнай сістэмы ішло па шляху нарастання канцэнтрацыі пасад у "цэкоўскай" наменклатуры з наменклатур ніжэйшых парторганаў з адначасовым пашырэннем спісаў пасад, якія ўваходзілі ў яе. У снежні 1936 г. Бюро ЦК КП(б)Б зацвердзіла новую наменклатуру ЦК КП(б)Б, прадстаўленую загадчыкам аддзела кіруючых партыйных органаў ЦК КП(б)Б А.А.Тавакальянам**. Па-першае, у яе склад ужо ўключаліся 384 работнікі, якія адначасова праходзілі і па наменклатуры ЦК УсеКП(Б). Сярод іх былі старшыня і сакратар ЦВК БССР, старшыня СНК БССР і тры яго намеснікі, старшыня Дзяржплана, пракурор рэспублікі, старшыня Вярхоўнага суда, наркамы, кіраўнікі Наргасуліку і Галоўнага ўпраўлення міліцыі. Па-другое, пашырыўся агульны спіс пасад наменклатуры ЦК КП(б)Б (да 4735 работнікаў). Па лініі савецкай адміністрацыйнай работы ў беларускую "цэкоўскую" наменклатуру ўвайшлі старшыні пастаянных камісій пры ЦВК БССР, намеснікі наркамаў,

---

* Дзеніскевіч Мікалай Міхайлавіч (1904—1937) — ураджэнец Мінскай губерні, з сям'і рабочага, член РКП(б) з 1921 г., у 1933—1934 гг. — загадчык аддзела кадраў ЦК КП(б)Б, у 1934—1937 гг. — сакратар Лёзненскага РК КП(б)Б, Віцебскага ГК КП(б)Б, другі сакратар ЦК КП(б)Б. Арыштаваны летам 1937 г. Асуджаны за *"удзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі правых"*. Расстраляны ў верасні 1937 г. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 25 лютага 1956 г.

** Тавакальян Авеціс Абгаравіч (1903—1937) — армянін, нарадзіўся на тэрыторыі Турцыі, член УсеКП(б) з 1925 г., арыштаваны ў жніўні 1937 г. як *"удзельнік трацкісцкай тэрарыстычнай групы"*. Расстраляны ў лістападзе 1937 г. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР у сакавіку 1956 г.

загадчыкі аддзеламі СНК і Дзяржплана БССР, старшыні і намеснікі старшыняў акрвыканкамаў* і райвыканкамаў, старшыні гарсаветаў і намеснікі старшынь Мінскага, Віцебскага і Гомельскага гарсаветаў, загадчыкі акруговымі, гарадскімі, раённымі зямельнымі, фінансавымі аддзеламі, аддзеламі ўнутранага гандлю, аховы здароўя і народнай адукацыі[18]. Адпаведным чынам карэкціравалася і наменклатура гаркамаў і райкамаў партыі.

Па наяўных звестках за жнівень—кастрычнік 1937 г. па 81 (з 90) сельскіх раёнах на персанальным уліку ў ЦК КП(б)Б знаходзілася 2966 чалавек. У сярэднім на раён па "цэкоўскай" наменклатуры прыходзілася 37 чалавек: акрамя работнікаў райкама партыі гэта былі старшыня райвыканкама і яго намеснік, загадчыкі райаддзелаў народнай адукацыі і аховы здароўя, інспектар наргасуліку, дырэктары МТС і іх намеснікі, начальнік райаддзелу сувязі, пракурор, суддзя, начальнікі райаддзелаў міліцыі і НКУС, кіраўнік банкам і інш. У залежнасці ад ступені эканамічнага развіцця і параметраў раёнаў колькасны і якасны склад раённай наменклатуры мяняўся. Так, найменшая колькасць "цэкоўскай" наменклатуры была ў невялікім Гарадоцкім раёне — усяго 11 чалавек. Больш за ўсё — у Бабруйскім раёне (65 чалавек), галоўным чынам за кошт дырэктараў і сакратароў парткамаў прамысловых прадпрыемстваў горада[19].

Пасля завяршэння "вялікай чысткі" 1937—1938 гг. вектар трансфармацыі наменклатурнай сістэмы змяніўся — ранейшая дэцэнтралізацыя (у рамках партапарату) у кадравай рабоце змянілася яе цэнтралізацыяй. Наяўнасць велізарнай масы выяўленых "ворагаў народа" ва ўсіх сферах кіравання і на ўсіх паверхах звязвалася з пралікамі ў арганізацыі работы з кадрамі, а павышэнне яе эфектыўнасці — з вяртаннем да вопыту наменклатурнай цэнтралізацыі 1920-х гг. У чарговы раз спрацаваў традыцыйны для партыйных кіраўнікоў (як, зрэшты, і для большасці насельніцтва краіны) інверсійны тып мыслення, які выяўляецца ў абсалютызацыі агульнай апазіцыі з выразным размежаваннем усёй разнастайнасці жыцця на два процілеглыя полюса, адзін з якіх набывае адназначна станоўчае значэнне, другі— гэтак жа адназначна негатыўнае (капіталізм — сацыялізм, буржуазная дэмакратыя — савецкая дэмакратыя, *"палымяныя змагары за справу народа" — "ворагі народа"* і г. д.). У выпадку няўдачы аднаго полюса адбываецца просты пераход да процілеглага з перастановай іх ацэнкі: адмоўнае — на станоўчае, станоўчае — на адмоўнае (такіх прыкладаў у савецкай і постсавецкай гісторыі можна прывесці мноства). Раскрытыкаваны ў пачатку 1930-х гг. прынцып цэнтралізацыі ў рамках партыйнага апарату наменклатурнай работы быў рэабілітаваны, адпаведна прынцып дэцэнтралізацыі — адкінуты як шкодны.

Выступаючы са справаздачным дакладам на XVIII з'ездзе УсеКП(б) (сакавік 1939 г.) І.Сталін паставіў задачу *"ўзяць цалкам у адны рукі справу падбору кадраў знізу даверху... пакончыць з расшчапленнем справы вывучэння, вылучэння і падбору кадраў па розных аддзелах і сектарах, засяродзіўшы яго ў адным месцы. Такім месцам павінна быць Упраўленне кадраў у складзе ЦК УсеКП(б) і адпаведны Аддзел кадраў у складзе кожнай рэспубліканскай, краёвай і абласной партарганізацыі"*[20]. З'езд зацвердзіў падрыхтаваную ў гэтым ключы чарговую новую рэдакцыю партыйнага Статута[21]. Пры ЦК УсеКП(б) ствараліся два ўпраўленні — упраўленне кадраў (яго ўзначаліў Г.М.Маленкоў) і ўпраўленне прапаганды і агітацыі, тры аддзелы (арганізацыйна-інструктарскі, сельскагаспадарчы, школьны). У сваю чаргу ў апараце ЦК кампартый саюзных рэспублік утваралася пяць аддзелаў (кадраў, прапаганды і агітацыі, арганізацыйна-інструктарскі, сельскагаспадарчы, ваенны), у апаратах гаркамаў і райкамаў — чатыры аддзелы (кадраў, прапаганды і агітацыі, арганізацыйна-інструктарскі, ваенны). У такой сістэме ўжо ўся кадравая наменклатурная работа зноў была цэнтралізаваная ва ўпраўленнях і аддзелах кадраў, у структурах якіх ствараліся сектары па галінах. У прыватнасці, у ЦК УсеКП(б) работнікамі дзяржаўных адміністрацыйных органаў стаў займацца аддзел кадраў савецкіх органаў упраўлення кадраў, у ЦК КП(б)Б — сектар кадраў савецкіх органаў. Для кіраўніцтва ўсёй наменклатурнай работай у абкамах, крайкамах і ЦК нацкампартый уводзілася пасада сакратара па кадрах. У ЦК КП(б)Б першым на гэтую пасаду ў чэрвені 1939 г. прызначылі Я.А.Жыляніна**. У лістападзе 1939 г. сакратаром ЦК КП(б)Б па кадрах стаў Г.М.Байкачоў***, у снежні 1941 г. — М.Я.Аўхімовіч****.

У сувязі са стварэннем у 1938 г. у БССР новага — абласнога — звяна адміністрацыйна-тэрытарыяль-

* В 1935 г. у БССР былі створаны чатыры прымежныя акругі — Лепельская, Мазырская, Полацкая і Слуцкая.

**Жылянін Якім Аляксандравіч (1903—1979) — ураджэнец Мінскай губерні, член РКП(б) з 1924 г., з 1935 г. — інструктар Віцебскага гаркама, сакратар Віцебскага, Аршанскага райкамаў КП(б)Б, у 1939 г. — сакратар ЦК КП(б)Б па кадрах, старшыня Часовага ўпраўлення г. Вільні, у далейшым — сакратар Магілёўскага, Віцебскага, Полацкага абкамаў КП(б)Б, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны, старшыня Магілёўскага аблвыканкама.

*** Байкачоў Рыгор Мяфодзьевіч (1906—1975) — ураджэнец Магілёўскай губерні, з сям'і рабочых, член УсеКП(б). 1933—1937 гг. — рэдактар раённай газеты, 1937—1939 гг. — у рэдакцыі "Савецкай Беларусі", 1939—1940 гг. — сакратар ЦК КП(б)Б па кадрах, у 1941—1944 гг. — адказны арганізатар ЦК УсеКП(б), у наступныя гады займаў кіруючыя пасады ў партыйных і дзяржаўных структурах у БССР і за яе межамі.

**** Аўхімовіч Мікалай Яфрэмавіч (1907—1996) — ураджэнец Мінскай губерні, член КП(б)Б з 1926 г., у 1937—1939 гг. — сакратар райкамаў КП(б)Б, 1940—1947 гг. — сакратар ЦК КП(б)Б па кадрах, з 1948 г. — сакратар Гомельскага і Гродзенскага абкамаў партыі, другі сакратар ЦК КПБ, старшыня Савета міністраў БССР, міністр, навуковы работнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

нага дзялення і адпаведнага абласнога апарату партыйна-савецкай улады ўзнікла патрэба ў выдзяленні абласной наменклатуры і карэкціроўцы "цэкоўскай" і "раённай" наменклатур. Па савецкай адміністрацыйнай галіне ў "цэкоўскую" наменклатуру з кіруючых работнікаў вобласці ўваходзілі старшыня аблвыканкама і яго намеснік, усе кіраўнікі абласных аддзелаў, упраўленняў (у шэрагу выпадкаў — іх намеснікі, начальнікі сектараў і бюро). З раённых кіраўнікоў ЦК КП(б)Б прызначаў старшыняў райвыканкамаў і раённых планавых камісій, загадчыкаў гарадскімі і раённымі дарожнымі аддзеламі, аддзеламі аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння і народнай адукацыі, раённымі зямельнымі аддзеламі, начальнікаў раённых кантор сувязі. Абкам партыі быў вышэйшай інстанцыяй для прызначэння і зняцця з пасады сакратароў, загадчыкаў аддзела кадраў і спецаддзела, інструктараў аблвыканкама, начальнікаў сектараў аблплана, старшыняў гарсаветаў, намеснікаў старшыняў райвыканкамаў і гарсаветаў, іх сакратароў, загадчыкаў гарадскімі і раённымі аддзеламі гандлю, фінансаў і шэрагу іншых пасад[22].

Уласна савецкая "раённая" наменклатура, па работніках якой райкамы самастойна прымалі рашэнне, складалася з загадчыкаў аддзеламі камунальнай гаспадаркі і мясцовай прамысловасці, дырэктараў райпрамкамбінатаў, фінагентаў райфінаддзела, загадчыкаў райбальніц і інспектараў аховы мацярынства і дзяцінства, упаўнаважаных па фізкультуры, інспектараў па дашкольным выхаванні і навучанні дарослых, старшыняў і сакратароў сельсаветаў[23].

На 10 лютага 1940 г. па сектары кадраў савецкіх арганізацый ЦК КП(б)Б праходзіла 380 чалавек, у тым ліку па мясцовых кадрах (абласныя, раённыя і гарадскія выканкамы) — 290. Цалкам зразумела, што абсалютную большасць іх складалі члены ці кандыдаты ў члены КП(б)Б (па ўсіх савецкіх работніках — 93,7%, па мясцовых — 99%). Асноўная іх частка ўступіла ў партыю ў 1926—1930 гг. (40,4% усіх савецкіх работнікаў, у тым ліку мясцовых — 42,4%), у гады "ленінскага набору" (па сутнасці ж гэта быў "сталінскі набор") і склала масавую аснову для зацвярджэння рэжыму асабістай улады І.Сталіна. Яшчэ 19,4% вялі свой партстаж з 1931—1933 гг., 14% — уступілі ў камуністычную партыю ў 1938—1940 гг. Узровень адукацыі савецкай наменклатуры быў нізкі, асабліва на месцах: вышэйшую адукацыю мелі 20% з тых, што праходзілі па сектары ЦК КП(б)Б, у тым ліку па работніках абласнога, раённага і гарадскога ўзроўню — 11,4%. Пераважная частка, як і раней, мела толькі ніжэйшую адукацыю (адпаведна 42,4% і 51%)[24]. Узрост большасці (67,8%) савецкіх работнікаў "цэкоўскай" наменклатуры быў да 40 гадоў — іх свядомае жыццё прыйшлося на савецкі перыяд, іх светапогляд сфарміраваўся пад уздзеяннем камуністычнай ідэалогіі, негатыўнага стаўлення да каштоўнасцяў "буржуазнага грамадства", у абставінах прававога нігілізму і ўмацавання адзінаасобнай улады І.Сталіна. Гэта была ў прамым сэнсе "сталінская наменклатура", кар'ера якой была звязаная з палітычнай кан'юнктурай і дэманстрацыяй сваёй асабістай адданасці правадыру.

Наменклатурная сістэма па-ранейшаму не была бездакорным механізмам і дапускала збоі. Нярэдка райкамы перамяшчалі раённых работнікаў "цэкоўскай" наменклатуры самастойна, без узгаднення з ЦК КП(б)Б, што перш за ўсё тлумачылася дэфіцытам на месцах кадраў кіраўнікоў. У студзені 1939 г. Бюро ЦК КП(б)Б вымушана было адзначыць, што *"ў шэрагу раёнаў... працягваецца практыка перакідання і зняцця работнікаў, якія ўваходзяць у наменклатуру ЦК КП(б)Б, без ведама ЦК КП(б)Б і яго аддзелаў"*, паказаўшы *"яшчэ раз"* райкамам партыі, што *"зняцце і перамяшчэнне на іншую працу работнікаў наменклатуры ЦК КП(б)Б можа ажыццяўляцца толькі са згоды ЦК КП(б)Б"*[25].

Тым не менш у канцы 1930-х гг. наменклатурная сістэма трывала замацавалася ў якасці галоўнага механізму кадравай палітыкі ў СССР. Фармалізацыя працэсу выбараў у саветы ўсіх узроўняў была завершана канчаткова. Па Канстытуцыі БССР 1937 г. (у рэдакцыі 1938 г.) вышэйшым органам дзяржаўнай улады ў рэспубліцы з'яўляўся *выбіраемы* грамадзянамі Вярхоўны савет, які *выбіраў* старшыню Вярхоўнага савета і двух яго намеснікаў. Менавіта Вярхоўны савет утвараў Савет народных камісараў як вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган дзяржаўнай улады БССР. На месцах органамі ўлады абвяшчаліся выбіраемыя насельніцтвам саветы дэпутатаў працоўных. У сваю чаргу выканаўчымі і распарадчымі органамі абласных, раённых, гарадскіх і сельскіх саветаў дэпутатаў працоўных з'яўляліся *выбіраемыя* саветамі выканаўчыя камітэты. Але ўсе ключавыя пасады ў саветах усіх узроўняў уваходзілі ў наменклатурны пералік і на справе іх маглі заняць толькі тыя, хто атрымаў санкцыю ад адпаведнага партыйнага органа. Пасля такога папярэдняга зацвярджэння іх кандыдатур дэпутатам саветаў толькі заставалася на сваіх сесіях партыйнае рашэнне ўхваліць і прыняць, як правіла, аднагалосна.

Практыка прамога прызначэнства на выбарныя пасады без нават фармальнай выбарчай працэдуры (кааптацыя), якая паўсюдна выкарыстоўвалася ў 1920—1930-я гг. на сумна вядомым пленуме ЦК УсеКП(б) (люты — сакавік 1937 г.) была асуджаная і забароненая[26]. Але гэтая забарона рэзка абмяжоўвала магчымасць выкарыстання традыцыйнага спосабу вырашэння бягучых кадравых пытанняў — перамяшчэння наменклатурных работнікаў з аднаго месца працы на іншае, з адной пасады на іншую. Так, па інфармацыі ЦК КП(б)Б, за 1937 г. змянілася 46,6% старшынь райвыканкамаў і гарвыканкамаў, за 1938 г. — 20,4%, а за 1939 г. — 74%. На сакавік 1940 г. тры чвэрці старшыняў райвыканкамаў працавалі на сваім месцы менш за год[27]. Пры такой цякучасці кадраў выкарыстоўваць законны выбарны механізм не ўяўлялася магчымым. Выхад быў знойдзены: прызначаны на выбарную паса-

ду кіраўнік да фармальнай працэдуры выбараў пачаў лічыцца *"часова выконваючым абавязкі"*. Па-сутнасці кааптацыя захавалася, але набыла іншы выгляд.

У 1920—1930-я гг. у пратаколах Бюро і Сакратарыята ЦК КПБ па кадравых пытаннях выбарных кіраўнікоў часцей за ўсё выкарыстоўвалася фармулёўка *"рэкамендаваць" ("рэкамендаваць старшынёй райвыканкама...")*, радзей — *"зацвердзіць...", "накіраваць...", "прызначыць...", "прадвызначыць пытанне аб прызначэнні..."*. Фармулёўка *"прадвызначыць пытанне..."* найбольш поўна адлюстроўвае савецкія рэаліі. Такая сістэма не выклікала масавай негатыўнай рэакцыі ні сярод насельніцтва, ні сярод саміх кіраўнікоў. Расійскі філосаф Э.Ю.Салаўёў выразна і ёміста ахарактарызаваў стан прававой культуры савецкага грамадства 1920—1930-х гг.: *"Права лічылася непаўнацэннай і нават недасканалай формай рэгулявання сацыяльнага жыцця; у ім бачылі адживаючы інстытут, толькі на час і толькі ў сілу сумнай неабходнасці запазычаны ў ранейшых эксплуататарскіх грамадстваў"*[28].

Ідэальны вобраз наменклатурнага работніка І.Сталін у сваёй лаканічнай манеры намаляваў на XVIII з'ездзе ВКП(б): *"...каб правесці ў жыццё правільную палітычную лінію, патрэбныя кадры, патрэбныя людзі, якія разумеюць палітычную лінію партыі, якія ўспрымаюць яе як сваю ўласную лінію, гатовыя правесці яе ў жыццё, якія ўмеюць ажыццяўляць яе на практыцы і здольныя адказваць за яе, абараняць яе, змагацца за яе"*[29]. І вырашальным для гэтага работніка выступалі (па перакананні І. Сталіна) *"палітычны ўзровень і марксісцка-ленінская свядомасць работнікаў"*. "Апазіцыйнае мінулае" (знаходжанне ў іншых партыях, у розных фракцыйных групах унутры бальшавіцкай партыі альбо нават невялікі кантакт з іх членамі) ужо з пачатку 1930-х гг. адназначна такому крытэрыю не адпавядала. Пажаданымі былі і "правільнае" сацыяльнае паходжанне (з рабочых або сялян), і практычны вопыт непасрэднай працы "ля станка" або "за сахой". Наяўнасць спецыяльных ведаў у градацыі якасцяў кадраў кіраўнікоў, натуральна, прызнавалася неабходным, але ўсё ж уяўлялася справай другараднай.

Усе наменклатурныя работнікі былі ўзятыя на строгі персанальны ўлік, які вёўся асобна ад агульнага партыйнага. На кожнага наменклатурнага работніка заводзілася асабістая картка, якая ўтрымлівала шэраг дакументаў (асабісты лісток, аўтабіяграфія, дзелавыя водгукі аб рабоце, звесткі аб канкрэтнай працы, паведамленні аб перасоўваннях па пасадах і арганізацыях работніка, спецзвесткі органаў НКУС). Таксама на кожную наменклатурную пасаду заводзілася службовая картка, дзе адлюстроўваліся ўсе персанальныя змены, якія праходзілі па гэтай пасадзе. Трапіць у склад наменклатуры азначала трапіць у *"камандны склад партыі і кіруючых дзяржаўных органаў"* (І.Сталін), рэзка ўзнімала сацыяльны статус чалавека, пашырала магчымасці кар'ернага росту, доступу да прывілеяў і паляпшэння свайго матэрыяльнага дабрабыту.

Нягледзячы на канцэнтрацыю ўсіх рэсурсаў улады ў руках наменклатуры, аб ператварэнні яе ў "клас" савецкага грамадства ў 1930-я гг. казаць яшчэ рана. Ва ўмовах чыстак і палітычных рэпрэсій наменклатура не змагла кансалідавацца, у яе не афарміўся свой "прыватны" інтарэс, ды яна, нават у выпадку яго з'яўлення, і не мела рэальных магчымасцяў яго адстойваць. Масавыя "перакіды" кіруючых работнікаў з месца на месца ўскладнялі фарміраванне мясцовых кіруючых кланаў, змацаваных уласнымі інтарэсамі, асабістымі сувязямі і ўзаемнымі асабістымі абавязкамі. Да канца 1930-х гг. наменклатура была толькі інструментам рэалізацыі стратэгічных і тактычных прыярытэтаў, якія вызначаліся вузкім пластам вышэйшага партыйнага кіраўніцтва і асабіста І.Сталіным.

[1] Руководящие кадры Р.К.П. большевиков и их распределение. М., [б.г.] /Электронный ресурс: http://www.opentextnn.ru/history/ rushist/sovigu /libraries/ staff%20 /?id=3835 — Дата доступа 15.10.2016.

[2] Гл. падрабязней: Елизаров С.А. Становление номенклатурной системы в БССР (1920-е гг.) /Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2016, № 1 (47). С. 9—13.

[3] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 4п, воп. 1, спр. 2015, арк. 2—6.

[4] Там жа. Спр. 2560, арк. 1—9.

[5] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (далей — ДАГАГВ). Ф. 3, воп. 1, спр. 597, арк. 11—15.

[6] Справочник партийного работника. Вып. 7. Ч. 2. М.—Л., 1930. С. 169—171.

[7] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 4768, арк. 232.

[8] ДАГАГВ. Ф. 205, воп. 1а, спр. 82, арк. 180.

[9] НАРБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 5128, арк. 27—29.

[10] Там жа. Арк. 24 — 24 адв.

[11] Там жа. Арк. 28.

[12] Там жа. Арк. 26.

[13] Падлічана аўтарам па: НАРБ. Ф. 6, воп.1, спр. 2432, арк. 64.

[14] НАРБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 6139, арк. 8-9.

[15] Там жа. Спр. 4774, арк. 224.

[16] Там жа. Спр. 6159, арк. 304 адв., 310.

[17] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (далей — КПСС в революциях...). Изд. 8. Т. 5 (1931—1941 гг.). М, 1984. С. 165.

[18] НАРБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 10863, арк. 1—25.

[19] Падлічана аўтарам па: НАРБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 11730, арк. 2—287.

[20] Сталин И. Отчетный доклад XVIII съезду партии о работе ЦК ВКП(Б) (10 марта 1939 г.) / И. Сталин. Вопросы ленинизма. Изд. 11-е. М, 1947. С. 597.

[21] КПСС в резолюциях... Т. 5. С. 366—397.

[22] НАРБ. Ф. 4п, воп. 1, спр. 13768, арк. 1—20.

[23] Там жа. Спр. 13769, арк. 1—5.

[24] Там жа. Спр. 14375, арк. 110-111.

[25] Там жа. Спр. 13613, арк. 30-31.

[26] КПСС в резолюциях... Т. 5. С. 289.

[27] НАРБ. Ф. 4п, воп. 1., спр. 14375, арк. 112-113.

[28] Соловьев Э.Ю. Правовой нигилизм и гуманистический смысл права /Квинтэссенция: Филос. альманах. М, 1990. С. 164.

[29] Сталин И. Отчетный доклад XVIII съезду партии о работе ЦК ВКП(Б) (10 марта 1939 г.). С. 595.